

# Роднае Слова

ISSN 0234-1360

3

2006

*Пяройдзе шлях у новы шлях,*
*Расстанне – ў новае спатканне,*
*Напеў жалейкі – ў труб гучанне,*
*Выток жыцця – ў жыцця працяг.*

Аркадзь КУЛЯШОЎ.

ШТОМЕСЯЧНЫ НАВУКОВЫ І МЕТАДЫЧНЫ ЧАСОПІС

# Роднае слова

3/219/2006
САКАВІК

ЗАСНАВАЛЬНІК:
МІНІСТЭРСТВА
АДУКАЦЫІ
РЭСПУБЛІКІ
БЕЛАРУСЬ

УСТАНОВА
«РЭДАКЦЫЯ ЧАСОПІСА
“РОДНАЕ СЛОВА”»

Часопіс выходзіць
з 1988 года
(у 1988 – 1991,
№№ 1 – 48,
выдаваўся пад назвай
“Беларуская мова
і літаратура ў школе”)

Галоўны рэдактар Міхась ШАВЫРКІН

Першыя намеснікі галоўнага рэдактара Алесь БЕЛЬСКІ, Мікалай ПРЫГОДЗІЧ

НАВУКОВЫЯ КАНСУЛЬТАНТЫ:

Радаслава АЛАДАВА
Уладзімір ГНІЛАМЁДАЎ
Віктар ІЎЧАНКАЎ
Аляксандр ЛАКОТКА
Уладзімір ЛАМЕКА
Сцяпан ЛАЎШУК
Васіль ЛІЦЬВІНКА
Алег ЛОЙКА
Аляксандр ЛУКАШАНЕЦ
Зінаіда МАЖЭЙКА
Валерый МАКСІМОВІЧ
Уладзімір МАРТЫНАЎ
Уладзімір МАРХЕЛЬ
Мікола МІШЧАНЧУК
Міхась МУШЫНСКІ
Вольга НЯЧАЙ
Міхась ПІЛІПЕНКА
Вячаслаў РАГОЙША
Іван РОЎДА
Васіль СТАРЫЧОНАК
Павел СЦЯЦКО
Міхась ТЫЧЫНА
Надзея УСАВА
Генадзь ЦЫХУН
Іван ЧАРОТА
Тацццяна ШАМЯКІНА
Іван ШТЭЙНЕР
Міхась ЯЎНЕВІЧ

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ:

Марына АБРАГІМОВІЧ
Галіна АДАМОВІЧ
Аксана БАГДАНАВА
Зінаіда БАДЗЕВІЧ
Сяргей ГАБРУСЕВІЧ
Тамара ГАБРУСЬ
Вольга ДАДЗІЁМАВА
Уладзімір КАЯЛА
Уладзімір КОПАН
Віктар КРАСНЕЙ
Іван КРУК
Яўген ЛАЎРЭЛЬ
Іван ЛЕПЕШАЎ
Аляксандр ЛУГОЎСКІ
Ева ЛЯВОНАВА
Вольга ЛЯШЧЫНСКАЯ
Аляксандр МАКАРЭВІЧ
Зоя МЕЛЬНІКАВА
Павел МІХАЙЛАЎ
Жана НРЫЙМАК
Васіль РАГАЎЦОЎ
Тамара САЎЧУК
Уладзімір СЕНЬКАВЕЦ
Валянціна СМЫКОЎСКАЯ
Уладзімір СОДАЛЬ
Аляксандра СТАНКЕВІЧ
Тамаш ТАМАШЭВІЧ
Ірына ТАЯНОЎСКАЯ

РЭДАКЦЫЙНАЯ РАДА:

Генадзь АРЦЯМЁНАК
Рыма БАБАШКА
Марыя БУБЕШКА
Вера БУЛАНДА
Віктар ВАБІШЧЭВІЧ
Аляксандр ГЕРЦЫК
Святлана ГРЫЦКЕВІЧ
Мікола ЖУКОВІЧ
Лілія КАЗЛОЎСКАЯ
Вольга КУЗЬМІЧ
Людміла КУТУЗАВА
Любоў ЛАЗАРЧЫК
Наталля ЛЕВІЧАВА
Вера ЛЯШУК
Ірына МЕЛЬНІКАВА
Мікалай НАВУМЧЫК
Зоя ПАДЛІСКАЯ
Тамара ПРАДЗЕД
Аляксей ПЯТКЕВІЧ
Валянціна РАМАНЦЭВІЧ
Вольга РУСІЛКА
Наталля САМУСЕВА
Аляксей СОЛАХАЎ
Марыя ФЛОР'ЯНОВІЧ
Канярына ЦІМАШКОВА
Людміла ЦІТОВА
Яўген ШУНЕЙКА
Святлана ЯЗЕРСКАЯ

## Над нумарам працавалі

**рэдактары:**

**Віктар Жыбуль** (*Філалогія:* Літаратура ў кантэксце жыцця, Беларуская літаратура ў кантэксце сусветнай, Шматгалосае рэха; *Методыка і вопыт:* Класікі на ўроку, Год Маці; *Міжпрадметныя сувязі:* Зямля пад белымі крыламі; *Культура Беларусі:* Віншуем!, Экранны летапіс; *На ростанях:* Педагагічная гасцёўня),

**Эдвард Карбановіч** (*Філалогія:* Літаратура і час; *Методыка і вопыт:* Імя ў школьнай праграме; *На ростанях:* Віншуем юбіляра!, Беларусь – зямля святая, Спадчына, Часу крэўная повязь, Карані і атожылкі),

**Ніна Мяцельская** (*Філалогія:* Разам з краінай),

**Крысціна Пучынская** (*Міжпрадметныя сувязі:* Школа юнага журналіста; *Культура Беларусі:* Лучнасць музаў; *На ростанях:* Каляндар памятных датаў і юбілейных дзён),

**Ларыса Сагановіч** (*Філалогія:* Таямніцы слова, Мова маёй зямлі, Як правільна сказаць па-беларуску, Культура мовы; *Методыка і вопыт:* Настаўнік прапануе, Прапануем план-канспект, Дыдактычны матэрыял, Старонка маладога лінгвіста; *Міжпрадметныя сувязі:* Чаму так назвалі?; *На ростанях:* Псіхалагічны універсітэт),

**Вольга Сідарава** (*Методыка і вопыт:* З вопыту настаўніка),

**Мірaслава Шавыркіна** (*Вокладка:* Зямля пад белымі крыламі; *Філалогія:* Вечная мелодыя жыцця; *Методыка і вопыт:* Скарбніца сусветнай педагагікі, Факультатыў “Стылістыка тэксту”, Матэрыялы да слоўніка),

**Лідзія Шагойка** (*Філалогія:* З гісторыі назваў, Мова мастацкіх твораў; *Методыка і вопыт:* На ўроку і пасля урокаў; *Калі закончыўся ўрок:* Даніна памяці),

намеснік галоўнага рэдактара **Міраслава Шавыркіна**,
адказны сакратар **Вольга Смольская**,
дзяжурныя рэдактары **Ніна Мяцельская, Лідзія Шагойка**,
карэктары **Ніна Мяцельская, Крысціна Пучынская, Вольга Сідарава**,
камп'ютарны набор **Сафіі Некрашэвіч, Наталлі Ермоленкі**,
камп'ютарная вёрстка **Ганны Каўганчук**,
галоўны бухгалтар **Святлана Яфімчык**.

НАВУКОВАЯ БІБЛІЯТЭКА

# Змест

## ФІЛАЛОГІЯ

**Максімовіч Валерый.** Упоравень з часам: Юбілейныя нататкі з нагоды 75-годдзя Інстытута літаратуры імя Янкі Купалы НАН Беларусі . . . 3
**Бельскі Алесь.** Пад знакам палыновай зоркі: Беларуская літаратура: 20 гадоў пасля Чарнобыля . . . 5
**Падлінская Зоя.** “Яно і нараканне, і сонца, і пякучай цемры сплаў”: Духоўны свет лірычнай гераіні Раісы Баравіковай . . . 11
**Угляніца Вольга.** “Яна павінна быць толькі маёй...”: Гендэрныя стэрэатыпы ў аповесці “Краявід з ментолавым пахам” Уладзіміра Арлова . . . 13
**Жылевіч Вольга.** “...З таго часу племя і ходзіць – з канца ў канец”: Матыў падарожжа ў сучасным рамане-прыпавесці (на матэрыяле французскай і беларускай літаратур) 16
**Кенька Міхась.** Адэкватнасць у вялікім і малым: Перастварэнні верша “Ларэляй” Генрыха Гейнэ . . . 19
**Крывіцкі Аляксандр.** Паклонімся бульбе . . 24
**Босак Віктар, Босак Алёна.** “Чалавек галодны ні на што не годны”: Назвы страў у гаворках Верхняга Над’ясельдзя . . . 26
**Андрыевіч Вольга.** Айконімы, суадносныя з імем *Іван*: Структура, утварэнне і пашырэнне 27
**Перавалава Наталля.** *Увaходзьце, калі ласка!*: Як правільна сказаць па-беларуску . . 28
**Каўрус Алесь.** “Кепска мне і з вамі...”: Пра нанісанне аднаго прыназоўніка . . . 29
**Зразікава Валянціна.** *Агнясталь, санцавей, шматструнне*: Назоўнікі-кампазіты ў творах першай паловы XX ст. . . . 30

## МЕТОДЫКА І ВОПЫТ

**Лаўрык Тацяна.** Васіль Сухамлінскі . . . 33
**Сухамлінскі Васіль.** Як выхаваць сапраўднага чалавека . . . 34
**Тычка Галіна.** “Непарушны закон існасці”: Штрыхі да партрэта Хрысціны Лялько . . 37
**Шатэрнік Усяслаў.** Гісторыя аднаго імя: Вобраз Сама ў паэме Янкі Купалы “Сон на кургане” . . . 38
**Навумчык Мікалай.** Вывучэнне балады “Маці” Аркадзя Куляшова. VIII клас . . . 42
**Міхайлоўская Ала.** Назоўнік як самастойная часціна мовы. VI клас . . . 43
**Жаўнерчык Алена.** Рэдагаванне тэкстаў: Навучальна-творчае Дальтан-заданне. X клас 45
**Мароз Святлана, Ржавуцкая Марына.** Сачыненне-апісанне на аснове асабістых назіранняў: Урок развіцця маўлення . . . 46
**Старасценка Таццяна.** Вобраз апавядальніка: Факультатыў “Стылістыка тэксту” . . 50
**Казлоўская Лілія, Прыймак Жана.** Паставы: Дыдактычны матэрыял . . . 53
**Долмат Валянціна.** Урок-гульня: “Мова. Маўленне”, “Сінтаксіс”, “Фанетыка і арфаэпія”. V клас. “Францішак Багушэвіч” і “Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч”. X клас . . 60
**Карпаў Уладзімір.** Сістэмная мадэль навуковай тэорыі . . . 62
**Лепешаў Іван.** У фразеалагічную скарбонку: Матэрыялы да слоўніка . . . 68
*Мае школьныя настаўнікі.* Ён умеў захапляць вучняў: З успамінаў *Лынькова М.* (36).

## МІЖПРАДМЕТНЫЯ СУВЯЗІ

**Падаляк Таццяна.** Жанры журналістыкі: Традыцыі і навацыі . . . 71
**Лакотка Аляксандр.** Міншчына – цэнтр беларускага краю . . . 74
**Лемцюгова Валянціна.** *Клецк. Лагойск. Койданава:* Чаму так назвалі? . . . 74

## КАЛІ ЗАКОНЧЫЎСЯ ЎРОК

**Буланда Вера.** “Пакуль вятры Чарнобыль раздзімаюць”: Сцэнар-эпітафія ў гонар жыхароў чорнай Белай Русі . . . 77

## КУЛЬТУРА БЕЛАРУСІ

**Карпілава Антаніна.** Талент навукоўцы і чалавека: Да юбілею Вольгі Нячай . . . 83
**Нячай Вольга.** Дзіцячае кіно Беларусі: Падлетак у віхуры гісторыі . . . 84
**Скарабагатаў Віктар, Шыкунова Ірына.** Станаўленне нацыянальнай оперы: Уладзімір Караткевіч – апостал адраджэння найноўшага часу . . . 88

## НА РОСТАНЯХ

**Жук Ігар.** Асветнік Аляксей Пяткевіч – абраннік традыцыі . . . 91
**Пяткевіч Аляксей.** Народнае светаўспрыманне і нацыянальная культура . . . 93
**Кісялёў Генадзь.** Францыск Скарына: Загадкі партрэта . . . 96
**Чыгрынава Людміла.** Нататкі пра маці Івана Чыгрынава і яго сям’ю . . . 100
**Рагойша Вячаслаў.** Захавальніца шляхетнага духу беларушчыны: Жана Дапкюнас і Дзяржаўны Літаратурны музей Янкі Купалы . . . 102
**Гарановіч Віталь.** У добры шлях: З гісторыі стварэння Глыбоцкай раённай гімназіі . . 105
**Анцінава Надзея.** Адзінота і імя: Псіхалагічны універсітэт . . . 106
**Шавыркін Міхась.** Хто мы? Беларусы...: Развагі над сутнаснымі складнікамі . . . 109
*Віншуем!* Місько Павел (18).
*Літаратурны ветразь. Багамолава А.* “Ты адпусціў мяне ў вырай...”. “Ты паспрабуй супрацьстаяць...”. “Быццам з келіхаў...”. “Нахіліся ніжэй...”. “Залаты ланцуг адзіноты...”. “Немагчымасць магчымага...”. “Распяты ветразь...”. “Мігатлівыя зоркі...” (111).
*Песню бярыце з сабою.* Мая князёўна (верш *Пецюкевіча У.*, муз. *Даўгалёва Дз.*) (112).
Каляндар памятных датаў і юбілейных дзён на 2006 год: Травень (32, 49, 108).

У адпаведнасці з Законам аб друку аўтары нясуць адказнасць за дакладнасць прыведзеных у артыкуле фактаў і звестак. Рэдакцыя пакідае за сабой права друкаваць артыкулы ў парадку абмеркавання, не падзяляючы пункту гледжання аўтара.

Аляксей ПЯТКЕВІЧ

# НАРОДНАЕ СВЕТАЎСПРЫМАННЕ І НАЦЫЯНАЛЬНАЯ КУЛЬТУРА

Чым адметная наша культура паводле свайго маральна-псіхалагічнага зместу? У чым яе нацыянальная своеасаблівасць? І які матэрыял найболын красамоўна раскрывае лад душы беларуса? Бо культура навуковая, мастацкая, рэлігійная рознымі сваімі складнікамі выяўляе розныя якасныя асаблівасці. А можа, яны нам здаюцца рознымі? А на самай справе з'яўляюцца кампанентамі цэласнай сістэмы, дзе ўсё гарманічна злучана і складае адзіны ўстойлівы комплекс народнага духу. Пэўна, што так. І гэтае меркаванне падмацоўваецца фактарам гістарычнай традыцыі, якая дзейнічала інтэнсіўна і, па сутнасці, бесперапынна на працягу дзесяці стагоддзяў. Так што хапала часу, каб культуры як духоўнаму арганізму этнасу можна было сфармавацца і на розных этапах гістарычнага жыцця карэктавацца і абнаўляцца. Гэта датычыць перш за ўсё народнай культуры з яе звычаёвым правам, абрадамі, песнямі і моўным арсеналам. Яна зберагла ў вельмі даўнім выглядзе гэтыя надта значныя свае складнікі. Можна нават сказаць, закансервавалася, бо хрысціянізацыя на беларускіх землях задоўжылася, расцягнуўшыся аж да XV – XVI стст. У выніку царква не змагла тут нейтралізаваць старажытных паганскіх вераванняў і ўяўленняў. Яны цесна перапляліся з хрысціянскімі, утварыўшы унікальны ў сваім родзе сімбіёз, што захаваўся да нашага часу і данёс такім чынам светабачанне далёкіх продкаў.

Каляды, Вялікдзень, Купалле, Дажынкі... Колькі ў іх першароднай паэтычнасці, што выяўляе даўняе яднанне чалавека з прыродаю, колькі зычлівасці, удзячнасці яе сілам! Але ў аснове паганскіх культаў – гаспадарчыя інтарэсы тагачаснага чалавека. І вельмі зямной была ўся паэзія каляндарнага цыкла. Наш прашчур ніяк не адрываўся ад земляробчай асновы жыцця, хоць і пакланяўся сонцу, якое, дарэчы, успрымалася нароўні з лесам, вадой, полем.

Такім чынам, беларускай народнай культуры ўласцівыя не столькі высокія паэтычныя арыенціры, колькі звычайныя: яны дапамагалі адкрываць прыгожае ў штодзённым жыцці. Таму і традыцыйная народная песня як істотная частка гэтай культуры, выказваючы мажорнае пачуццё, ураўнаважвала яго, як правіла, журботным, нават балючым. Менавіта арганічнае зліццё светлага і сумнага ў песеннай мелодыі (і ў тэксце) гаворыць вельмі многа пра беларускае народнае светаадчуванне. Вось, напрыклад, хрэстаматыйны ўзор народнай песні – “Ой, рэчанька, рэчанька...”. Ужо ў гэтым падвойным прамым звароце, выказаным памяншальна-ласкальнай назоўнікавай формай, месціцца паэтычнае цёплае пачуццё. Аднак яго працяг напаўняецца жалем, шкадаваннем страт: “Чаму ж ты не поўная, / з беражком не роўная?..”. І ўжо пацякла лірычная плынь складанага, неадназначнага зместу. Далейшая фонавая “застаўка” – “люлі, люлі, люлі” – своеасабліва нейтралізуе пэўныя крайнасці перажывання, уводзіць іх у суцэльнае рэчышча. На гэтай эмацыйнай хвалі складваецца паэтычныя сітуацыя (“Янка коніка паіў, / Кася воду чэрпала”), якая дапускае рознае лірычнае развіццё – і журботнае, і ўсцешнае. Увогуле ж, песенны зачын вельмі часта ўмя-

шчае ў сабе згаданую дваістасць і рыхтуе слухача да прыняцця свайго роду філасофскай ісціны: гора і радасць ідуць у жыцці поплеч і лёгка могуць саступіць адно аднаму дарогу: "Цвіла, цвіла ружа-кветка, / цвісці перастала"; "А ў полі вярба нахілёная, / маладая дзяўчыночка заручоная"; "Ой, ляцелі гусі з далёкага краю, / замуцілі воду на ціхім Дунаю"; "Кацілася ясна зорачка, / дый упала да долу". Прытым лірызм традыцыйнай песні, гэты голас народнай душы, мяккі і сардэчны, сагрэты любоўю да жыцця. Але спавядальная сіла паэтычнага выказвання пазбаўленая звычайнага абвостранага драматызму, экспрэсіі. У рускай жа песні дэманструецца асаблівы размах перажывання, ва ўкраінскай – асаблівая чуллівасць. Беларуская народная традыцыя часцей пазбягала таго, каб выстаўляць напаказ і балючае, і радаснае. Эмацыйная прытоенасць (паўтон), якая рэалізуецца нярэдка пры дапамозе лёгкага гумару, самаіроніі і за якой хаваецца ўсталяваны маральна-этычны закон, – яшчэ адна характэрнасць беларускай народнай культуры, яе стылёвая рыса.

Гэты спектр беларускага светаўспрымання добра перадаў пейзажнымі палотнамі Вітольд Бялыніцкі-Біруля. Мастак найбольш любіў пераходную пару ў прыродзе, калі непрыкметна змешваліся яе розныя станы, і пісаў пераважна раніцу або вечар, вясну або восень. Прытым асабліва цаніў спакой у прыродзе, які імпанаваў сузіральна-задушэўнаму ўспрыманню ("Сакавіцкае змяркanne", "Пачатак вясны", "Ціхая восень", "У канцы зімы", "Ранняя вясна", "У час цішыш", "Зазелянелі беларускія бярозкі", "Задуменныя дні восені", "Пачатак восені", "Лотаць зацвітае", "Прыцемкі юнага мая", "Лёд прайшоў", "Блакітнай вясной", "Восеньскія дні", "Вясновыя воды"). Родная прырода ў яго неэфектная: чэзлыя бярозкі ля балотца ці шэрай раллі, што тонуць у ліловай смузе, роўная плынь халаднавата-шызай вады ў прытуманенай прасторы, рудаваты ўзлесак з рэшткамі восеньскага лісця ціхай вячэрняй парой. Чуецца ў яго творах камерная элегічная нота. Гэта майстар каларыту, які цураўся яркіх тонаў, сонечнага святла, умеў сумясціць колеры ў цёплай прыглушанай гаме.



Разам. Аляксей Пяткевіч у родных мясцінах з жонкай Марыяй і дачкой Марынай. Вёска Новы Свержань Стаўбцоўскага раёна, 1969 г.

Па-іншаму, але таксама выразна гавораць пра беларускую рэчаіснасць жывапісныя палотны Фердынанда Рушчыца. Асабліва гэта датычыць твораў ранняга перыяду – канца XIX – пачатку XX ст. Схільны да алегарычнай, знакавай вобразнай мовы, мастак разгарнуў матыў самотнага лёсу, слабога перад стыхіяй жыцця. Закінутая будыніна, стары млын, апусцелая сядзіба, касцёл, прыгрэбнік і нават постаць адзінокага аратага за плугам выклікаюць пачуццё спагады да ўсякай неўладкаванасці, сіратлівасці жыццёвага стану. Ці, напрыклад, дзве маленькія фігуркі падарожнікаў на бяскрайнім полі ("У свет"), што шукаюць сваю сцяжынку, кіруючыся ў невядомасць... Скрозь адчуваецца беспрытульнасць жыцця, звязаная з надзеяй на вырашэнне нейкіх адвечных яго пытанняў. Прыгадваюцца тут радкі Якуба Коласа: "І стаіш ты, смутны, / Доўга пазіраеш, / Як бы нешта страціў, / А што – сам не знаеш". Гэта з верша "Адлёт жураўлёў", вельмі сугучнага з беларускай душой матывамі дарогі, расстання, страты. Жураўліны вырай у трактоўцы Я. Коласа выклікае знаёмае ўжо журботна-светлае пачуццё: "Жаласна-прыгожа льюцца ў небе гукі". Ён, Якуб Колас, надта характэрны беларускі пісьменнік і стылем творчасці, і здольнасцю перадаваць этнапсіхалагічнае "я" свайго народа. Мяккая сардэчная танальнасць, стрымана-гутарковая інтанацыя, схільнасць да разваг, рэфлексій, увага да звычайных, побытавых пластоў жыцця, уменне ўспрымаць яго розныя грані і адчуваць іх гарманічную суладнасць, рэалістычная канкрэтыка малюнкаў, урэшце, глыбокае аўтарскае замілаванне да свайго, роднага – гэтыя разам узятыя стылёвыя ўласцівасці менавіта беларускай культуры. І не які іншы твор, а якраз "Новая зямля" Якуба Коласа стала выявай беларускага народнага духу, найлепшым рэзанатарам народнай маралі, этыкі, педагогікі, эстэтыкі, народнай філасофіі жыцця.

Пэўнымі асаблівасцямі таленту ўпісваецца ў гэты кантэкст Максім Гарэцкі. Красамоўныя назвы яго буйных твораў: "Ціхія песні" (пазнейшая назва "Ціхая плынь"), "Меланхолія", "Камароўская хроніка", "Антон", "Дзве душы". Апошняя характэрная тэндэнцыяй перадаваць розныя, нават процілеглыя, эмацыйна-псіхалагічныя якасці жыцця. Пісьменнік настойліва шукаў глыбінныя загадкі чалавечага быцця, стараўся пранікнуць у "патаёмнае". Зрэшты, пра гэта ёсць і ў Я. Коласа ("У старых дубах", "Выстагнаўся", "Старыя падрызнікі"). А ў трылогіі "На ростанях" самааналіз галоўнага героя займае вельмі важнае месца ў мастацкай канцэпцыі характару.



**Аляксей Пяткевіч і Алена Міхайлаўна Лойка (сястра Якуба Коласа) са студэнтамі гісторыка-філалагічнага факультэта Гродзенскага педінстытута ля Музея Якуба Коласа. Мінск, 1962 г.**

Беларускі чалавек, з аднаго боку, даўно прызвычаіўся жыць і дзейнічаць удумліва, з аглядкаю, зазіраючы ў сябе самога, шбы кантралюючы сябе. Навучыла гэтаму жыццё. Увогуле, думаць, азглядаючыся навокал, зацікаўлена вывучаючы ўсё, што трапляла ў поле зроку, наш зямляк павінен быў у выніку цеснага сужыцця з прыродаю. З другога боку, адносіны з прыродаю выпрацоўвалі непасрэднасць успрымання свету. Яе выдатна перадаў зноў жа Якуб Колас. А, напрыклад, Кузьма Чорны з яго паглыбленым псіхалагічна-філасофскім аналізам жыцця выглядае крыху “літаратурным” у параўнанні з “натуральным” Якубам Коласам. Хіба што ранні раман К. Чорнага “Зямля”, дзе ўнутраны свет чалавека прыхаваны за драбніцамі штодзённага жыцця і праглядваецца ў той ці іншай, хоць і прыглушанай, эмацыйнай ноце малюнкаў і сцэн, можа прэтэндаваць на тое, каб быць ключом, якім адмыкаецца нацыянальная дамінанта нашай культуры. А далей? Паказальнай тут можа быць творчая манера празаікаў Міхася Стральцова, Вячаслава Адамчыка, Віктара Карамазава, Анатоля Кудраўца, Артура Цяжкага, паэтаў (такіх розных, падкрэслім) Максіма Танка, Ларысы Гешюш, Генадзя Бураўкіна, Ніла Гілевіча, Міколы Арочкі, Дануты Бічэль, Яўгеніі Янішчыц. Толькі як жа быць з іншымі прызнанымі аўтарытэтамі, з “разнатраўем”, шматколернасцю беларускай літаратуры, як і іншых мастацтваў? Багацце і самабытнасць індывідуальнасцяў, тым больш такіх магутных, як Аркадзь Куляшоў, Наталля Арсеннева, Уладзімір Караткевіч, Васіль Быкаў, Рыгор Барадулін, Алесь Разанаў, Сакрат Яновіч, Андрэй Макаёнак, Іван Пташнікаў, Аляксей Дудараў, хіба перакрэсліваюць арыгінальнасць і цэласнасць нацыянальнай культурнай прасторы? Вядома, не. Нават наадварот, сведчаць пра жыццядзейнасць гэтай культуры, яе здабыткі, яе вялікія творчыя магчымасці. Бо кожная буйная постаць у культуры высвятляе сваёй дзейнасцю нейкую асобную, часам малапрыкметную яе грань. Але сілай сваёй энергетыкі надае ёй такую яркасць, што выглядае не зусім і аргашічнаю. Скажам, Янка Купала ці Уладзімір Караткевіч... Будучы паслядоўнымі рамантыкамі, яны выходзяць за рамкі нацыянальнага стылёвага стандарту. Аднак іх творчасць, народжаная нацыянальнымі патрэбамі свайго часу, мела жыццёвую аснову, вынікала з адпаведнай традыцыі, хоць і не надта выразнай. Бо беларусы ўсё ж не рамантыкі (у цэлым) паводле гістарычна сфармаванага менталітэту. Але вылучыўшы на авансцэну жыцця такія фігуры, засведчылі, што ім не чужыя і ўзвышаная мара, і бунтарскі дух. Тое самае датычыць і іншых арыгінальных і моцных асоб, калектываў, устаноў, якія “вырываюцца” з агульнай сістэмы нацыянальнага духоўнага развіцця, але не выпадаюць з яе, а пакідаюць свой глыбокі след і такім чынам удакладняюць уяўленне пра фармат беларускага культурнага поля.

Адметнасць культурнага жыцця беларусаў выяўляецца і ў рэлігійным рэчышчы. Вялікая паганская спадчына, што злілася з хрысціянскай духоўнай традыцыяй, шмат у чым “зазямліла” рэлігійнасць людзей, аслабіла яе, прынамсі, пазбавіла артадаксальнасці. Гэта ў роўнай ступені датычыць і праваслаўных, і каталіцкіх вернікаў. Невыпадкова на Беларусі сфармавалася яшчэ з часоў Рэнесансу школа іканапісу, адметная прыкметным адыходам ад канона – дэкаратыўнасцю вобразнай мовы, псіхалагізацыяй трактоўкі персанажаў, ужываннем элементаў народнай побытавай атрыбутыкі. Характэрна, што і ў архітэктуры беларускіх храмаў выкарыстанне класічных мастацкіх стыляў – готыкі, барока, класіцызму – суправаджалася прыстасаваннем іх да мясцовых умоў. Так з’явілася беларуская готыка, беларускае барока (віленскае), больш аслабленыя, мяккія паводле сродкаў мастацкай выразнасці. Нават цэрквы рэтраспектыўна-рускага стылю нясуць на сабе сляды тутэйшых густаў, асабліва ў дэкаратыўным афармленні.

Паказальныя ў беларускім культурным кантэксце храмы народнага драўлянага дойлідства. Будаваліся яны ў XVII – першай палове XIX ст. пераважна як уніяцкія цэрквы. Невялікія аб’ёмам, зробленыя “пад вянок”, пазней шаляваныя, з маленькімі галоўкамі купалоў, невысокімі, у некалькі ярусаў вежамі, з між’яруснымі карнізамі-стрэшкамі, якія надаюць кампазіцыі ўтульны хатні выгляд, гэтыя храмы павінны былі яднаць праваслаўных і каталікоў Беларусі, што, дарэчы, і было ажыццёўлена на канец XVIII ст., калі уніяты склалі тры чвэрці насельніцтва краю, а ў сельскай мясцовасці – да 80%.

Умеранасць рэлігійных пачуццяў людзей розных хрысціянскіх канфесій, іх традыцыйнае гістарычнае суіснаванне і, вядома, немалая гісторыя уніяцтва на Беларусі паспрыялі ўсталяванню верацярпімасці ў грамадстве. Праўда, шматканфесійнасць не была карыснай для нацыянальнай кансалідацыі людзей. Таму мацаванне нацыянальных пачаткаў жыцця, якое застаецца актуальным і якое ідзе праз шанаванне роднай гісторыі, культурнай спадчыны, беларускай мовы, дзяржаўнага суверэнітэту, непасрэдна звязана з далейшым канфесійным узаемаразуменнем і ўзаемазбліжэннем. Гэта цалкам адпавядае традыцыйнаму народнаму светаадчуванню і нацыянальна-культурнаму архетыпу беларусаў.